# Эпічны чалавек і яго карціна свету ў творчай спадчыне Якуба Коласа

© Вярбіцкая В. І.
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў»,*
***Мінск***

*У артыкуле аналізуецца культуралагічная інтэнцыя творчасці Якуба Коласа. У прыватнасці, выяўляецца вобраз суб'екта этнічнай культуры. Беларус наказаны Якубам Коласам як эпічны чалавек з яго адметнай карцінай свету, менталітэтам, светапоглядам. Значнае месца адведзена адлюстраванню архетыпавых вобразаў у беларускай этнічнай культуры. Галоўны акцэнт зроблены на характарыстыцы светаўспрымання беларусаў як язычніцкага, першароднага. Паўсядзённыя, звычайныя для кожнага чалавека з'явы прыроды пісьменнік услед за беларускім селянінам успрымае як жывое жыццё, надзеленае чалавечымі якасцямі і схільнасцямі. Карціна свету ва ўяўленні беларуса выводзіцца Якубам Коласам населенай дзівоснымі істотамі, якія жылі не толькі на небе, але і ў розных кутках зямлі. Рэлігійны, а пазней паэтычны вобраз бога-сонца ствараўся фантазіяй народа ў адпаведнасці з велізарнасцю, магутнасцю з'явы. Даследаванне літаратурных тэкстаў Якуба Коласа дае аўтару падставу сцвярджаць, што ў творчай спадчыне пісьменніка адлюстраваны кодавыя, універсальныя першавобразы, звязаныя з архетыпам Зямлі. Прыроднае асяроддзе становіцца сферай яго этнічнай прыналежнасці, вытокам фарміравання нацыянальнай душы і ментальнасці. Родная зямля для паэта становіцца асяроддзем этнакультурнага зместу жыцця беларуса.*

*Ключавыя словы: светапогляд, карціна свету, архетып, манументальны вобраз беларуса.*

(Искусство и к-улът-ура. — 2011. — №3(3). — С. 66-71)

# An epic man and his vision of the world in Yakub Kolas's works

© Viarbitskaya V. I.
***Educational establishment "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk***

*The article analyzes cultural intension of Yakub Kolas's works. To be more precise, the image of the subject of ethnic I culture is established. A Belarusian by Yakub Kolas is an epic man with his noticeable vision of the world, mentality, world outlook. A significant place is given to picturing archetype images in Belarusian ethnic culture. Main stress is given to the characteristics of the world perception by Belarusians as pagan, primal. Everyday, usual for any person phenomena of nature the author perceives, like a Belarusian pesant, as living life posessing human traits and habits. Yakub Kolas drives the picture of the world for a Belarusian from the inhabited by magic beings which lived both in heaven and different corners of the world. The religious and later poetic image of God -sun was made up by the I fantasy of the people in correspondence with the greatnes, power of the phenomenon. The study of literary texts by Yakub Kolas makes it possible for the author to state that the artistic heritage of the writer illustrates coded universal I prime images connected with the archetype of Earth. Natural environment becomes the sphere of his ethnic belonging, source of the formation of the national soul and mentality. Native land for the poet becomes the environment of etnic and cultural content of a Belarusian's life.*

*Key words: world outlook, pisture of the world, archetype, monumental image of a Belarusian.*

(Art and Culture. — 2011. — No. 3(3). — P. 66-71)

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* kafkult@buk.by — В. І. Вярбіцкая 66

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэхнагенная цывілізацыя выклікала сярод значнай часткі беларусаў узмацненне адчування ўнутранай дысгармоніі чалавека, сацыяльнай нестабільнасці, разбалансаванасці яго адносінаў з наваколлем, садзейнічала выбуху стрэсавых станаў, дэструктыўнасці, бездухоўнасці, страху і няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. Зменшыць уплыў на асобу энтрапійных з'яў магчыма ў працэсе рэвіталізацыі культурных традыдый беларускага этнасу, яго маралі, каштоўнасцей. У якасці рэпрэзентатара патрыятычных. маральна-этычных, эстэтычных каштоўнасцей беларускай культуры выступав творчая спадчына Якуба Коласа.

Мэта артыкула — адлюстраванне філасофскага светапогляду Якуба Коласа ў непарыўнай сувязі з працоўным народам і яго драматычным існаваннем на роднай зямлі.

Якуба Коласа глыбока закранае праблема чалавека, таямніца яго лёсу, месца ў грамадстве і сусвеце. «Ніколі не страціць для нас цікавасці чалавек, — пісаў народны паэт Беларусі — бо праяўленне яго розуму бязмеж- на, бо дарогі яго не вызначаны, бо формы яго жындя і адносіны да другіх людзей бясконца разнастайньм, канчаткова не выяўлены і ніколі не могуць стаць канчатковымі» [6, с. 12-13].

**Праблема стварэння духоўнага свету беларуса.** Пісьменнік стварыў манументальны вобраз беларуса як эпічнага чалавека з палкім тэмпераментам і ўзвышанымі высакароднымі імкненнямі, уласнымі ўяўленнямі пра навакольны свет і жыццёва-маральным кодэксам, разуменнем прыгожага і агіднага, крыштальна чыстым сумленнем і непахіснасцю ў змаганні за здзяйсненне ўласных ідэалаў. Сацыяльныя супярэчнасці са сферы знешніх адносінаў Колас пераносіць у сферу духоўнага ўнутранага жыцця сваіх літаратурных герояў.

У аснове этнічнай культуры беларуса, — сдвярджае Якуб Колас, — знаходзіцца своеасаблівая карціна свету. Як вядома, культуры адрозніваюцца адна ад другой не проста пэўнымі элементамі свядомасці (нормамі, каштоўнасцямі, арыентацыямі і т.д.), а асаблівасцямі сваёй кардіны свету, з якой вынікаюць усе гэтыя элементы. Карціна свету — універсальны атрыбут суб'екта культуры. Э. Фром слушна сцвярджаў, што без «...пэўным чьшам арганізаванай і ўнутрана звязанай карціны свету і нашага месца ў ім — людзі проста разгубіліся б і не былі здольныя да мэтанакіраваных і паслядоўных дзеянняў...» [9, с. 317]. Можна сказаць, што карціна свету — гэта своеасаблівая контурная схема прасторы і часу, адносінаў паміж аб'ектамі, парадку, які кіруюць вядомыя чалавеку вобразы і паняцці ў адзіны глабальны вобраз, у якім утрымліваецца ўсё, з чым ён сутыкаецца ў жыцці. Даследаванні паказваюць, што ўласная карціна свету служыць чалавеку на працягу ўсяго яго жыцця своеасаблівай абаронай. З яе вынікаюць ідэалы і сістэма каштоўнасцей, карыстаючыся ёю як сістэмай маральна-эстэтычных каардынат, чалавек упэўнена арыентуецца ў навакольным асяроддзі, прымае адэкватныя рашэнні і адчувае поўную адказнасць за свае ўчынкі. У выпадку яе распаду чалавек губляе сваю сістэму маральна-эстэтычных каардынат, не атрымліваючы ўзамен іншай, паўна- вартаснай сістэмы.

У нейзажнай коласавай лірыцы («Усход сонца», «Ручэй», «Адлёт жураўлёў», «Вясна» і інш.) паэт паказвае, што ў светаўспрыманні беларусаў ёсць нешта язычніцкае, першароднае. Нават на паўсядзённыя з'явы, такія, як усход сонца, навальніца, мароз, вецер, хмаркі, сонца, селянін глядзіць як на жывую прыроду, надзяляе іх чалавечымі якасцямі і схільнасцямі. Беларус надзяляў свет дзівоснымі істотамі, якія жылі не толькі на небе, але і ў розных кутках зямлі. Выгляд паднябесся з сонцам, месяцам, зоркамі наводзіў чалавека на думку: адкуль гэта ўсё, дзеля чаго? Рэлігійны, а пазней паэтычны вобраз бога-сонца ствараўся фаптазіяй народа ў адгіаведнасці з велізарнасцю, магутнасцю з'явы, якой коласаўскі герой не мог сабе растлумачыць.

У паэме «Сымон-музыка» Якуб Колас сцвярджае, што асэнсаваным, духоўным жыццём жыве не толькі чалавек, а і дрэва, птуш- ка, ручай: «Не ў адной толькі нашай дуты // Зерне ёсць характва — // Аб ім казку складае ў цішы // Колас нівы, трава [5, с. 81]. Жыццё прыроды тут, як бачым, становіцца падставай для філасофскіх аналогій, паралеляў, асацыяцый з чалавечым быццём. Прырода для беларуса — гэта, з аднаго боку, асобнае і аўтаномнае ўлонне, якое ўспрымаецца ім як умяшчальня таямніц і загадак, а з другога, яна — маці і настаўніца, якая вучыць, падказвае яму штосьді важнае, тое, як жыць, існаваць, уладкоўваць асабісты і грамадскі свет.У іншых творах паэта таксама гучыць ідэя аб лучнасці «быцця і небыцця», аб здольнасці ўсяго існа- га, што ёсць у бязмежным свеце, адчуваць, жыць адметным жыццём, быць часцінкай гарманічнай суладнасці існага. Асабліва яскрава глыбінна-адухоўленая сувязь вясковага жыхара з сусветам, космасам адлюстравана ў паэмах «Сымон-музыка», «Новая зямля», у трылогіі «На ростанях». Так, Сымон паказаны Коласам як дзіця сусвету, якое алякуюць касмічныя сілы: яму «зоркі... спагадаюць», а «сонца —

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

радасць, сонца — казка, што зганяе з сэрца дым» [5].

**Асноўныя архетыпы ў лірыцы Я куба Коласа.** Шырока абагульненая карціна быцдя ствараецца Якубам Коласам праз такія вобразы-архетышы, як агонь, вецер, вада, дрэва, агонь, сонца, балота, поле, лес, якія адначасова і боскія, і дэманічныя. Пры аналізе семантыкі коласаўскіх вобразаў можна рэканструяваць старажытны сэнс гэтых і іншых а.рхетыпаў і аднaчасова знайсці асабіста аўтарскае налаўненне вобраза-архетыпа. Актуалізацыя архетыпаў найболып заўважная падчас крызісу ў грамадстве. На гэтым этапе сацыякультурнай дэструкцыі суб'екты этнанацыянальнай культуры імкнуцца вярнуцда да сваіх вытокаў.

Выключнае месца ў этнічнай культуры беларусаў, на якую абапіраецца Якуб Колас, належыць архетыпу Сонда як элементу астранамічнага кода традыцыйнай мадэлі свету. Дадзены архетып мае ўстойліва высокі семіятычны статус і адносіцца да надзвычай станоўчага полюса аксіялагічнай шкалы. Якуб Колас у сваіх творах выказвае пачуцці падзякі, павагі, дабрыні да сонца як крыніцы ўсякага дабра і ласкі. У вуснапаэтычнай творчасці яно выступае найвышэйшым увасабленнем касмічнага агню, ідэальным упарадкаваннем свету. Гэты матыў мае месца ў шэрагу паэтычных твораў паэта: «Выходзіць Сонца ў свой абход, // Дарогаю спрадвечнай, //За дня- мі дні, за годам год // Плывуць у бесканеч- насць» [4, с. 19]. Грунтуючыся на народная традыцыі, Якуб Колас па-майстэрску выкарыстоўвае для асэнсавання архетыпа сонца такі паэтычны сродак, як персаналізацыо. Сонца надзяляецца паэтам чалавечымі ўласціваcцямі і якасцямі. Адухаўляючы вобраз сонца нярэдка сустракаецца ў коласаўскім тэксце: « А сонейка так ласкава, так хораша пазірае на зямлю, як матка на сваё дзіця» [4, с. 214].

У рамантычна-філасофскім кантэксце раскрывае Якуб Колас сутнасць сонца як спрадвечнай крыніцы цяпла і святла: // «І вось яна, жыцця крыніца, // Сама багіня- чараўніца, // Узышла на небе і міргнула, // Расу ў брыльянты абярнула (4, с. 219]. З вышэйсказанага вынікае, што архетып сонца ў коласаўскай творчасці гтаўстае ў розных сацыякультурных функцыях. Сонца разам з зямлёй падаюцца асяродцзем, у якім жыве і дзейнічае чалавек. У творах Якуба Коласа сонца амаль ніколі не падаецца ізалявана, а заўсёды ў комплексе з зямлёй, полем, нівай, лугам, лесам, рэчкай і г. д. У разуменні паэта сонца і зямля з'яўляюцца неад'емнай часткай Космасу, асноўнымі касмічнымі стыхіямі.

Архетып Зямлі ўвасоблены Якубам Коласам з той жа грунтоўнасцю, што і Сонца. У міфапаэтычнай творчасці беларусаў зямля ўяўлялася як першаэлемент, з якога ствараўся Сусвет. Узнікла яна ў выніку падзелаў спрадвечнага Хаоса на верх і ніз, Неба і Зямлю. Яна асэнсоўвалася як усеагульная крыніца жыцця, маці ўсяго жывога.

Адметнае стаўленне народнага паэта да зямлі адчуваецца ў многіх яго творах. Ужо ў першых коласаўскіх вершах адчуваецца ўзвелічэнне і паэтызацыя маці-карміцелькі зямлі: «Леглі гожымі радамі // Вузкія загоны, // Апранула зямля-матка, // Кажушок зялёны [1]. У літаратурных творах першастыхійны спрадвечны, звышзначны сэнс архетыпа зям- лі раскрываецца Якубам Коласам з філасофскай напоўненасцю. У коласавай мадэлі Космосу бліжэйшай быційнай прасторай, з якой знітаваны яго літаратурныя героі, з'яўляецца зямля. З ёю яны болып злучаны нават, чым з соцыумам. Зямля, на першы погляд, як звычайная матэрыяльная рэч, як сродак матэрыяльнага дабрабыту, паўстае ў творчай спадчыне паэта ў сімвалічным вобразе, спасцігнуць які магчыма коштам велізарнай духоўнай працы.

Духоўная прысутнасць, вобраз і імя Бога ў асэнсаванні архетыпа зямлі ў літаратурных творах паэта даволі прыкметныя. Рэлігійна-сакральны элемент адчуваецца ў зборніках «Песні жальбы», «Казкі жыцця», у паэмах «Новая зямля», «Сымон музыка» і інш. На наш погляд, створаны Якубам Коласам архетыпавы вобраз роднай зямлі змяшчае ў сабе вялікі эстэтыка-экалагічны патэнцыял. Старонкі коласаўскіх твораў, прысвечаныя прыродзе, здольныя выхоўваць пачуццё любові і захаплення прыродай, імкненне аберагаць яе прыгажосць.

Даследаванне літаратурных тэкстаў Якуба Коласа дае падставу сцвярджаць, што ў яго творчай спадчыне адлюстраваны таксама і іншыш кодавыш, універсальныя першавобразы, звязаныя з архетыпам Зямлі. Тэта перш за ўсё лес, поле, балота, неба, возера, рака, сонца і г. д. Прыроднае асяроддзе, намаляванае Якубам Коласам, становіцца сферай яго этнічнай прыналежнасці, вытокам фарміравання нацыянальнай душы і ментальнасці. Родная зямля для паэта становіцца асяроддзем этнакультурнага зместу жыцця беларуса сярод прыроды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Правобразам прыроднага свету паўстае ў Якуба Коласа лес, які займае ў беларускім Космасе важнейшае месца. Як вядома, у міфалогіі мадэллю Космасу з'яўляецца сусветнае Дрэва, падзеленае на тры вертыкальныя зоны: верхняй яго зоне (Небу) адпавядае карона, сярэдняй (Зямля) — ствол, а ніжняй (Апраметпай) — карэнне. У беларускім фальклоры сусветнае Дрэва атаясамлялася з вобразам розных дрэў, але найчасцей з высокім дубам. Таму вобраз дрэва ў натурфіласофіі Якуба Коласа ўяўляецца як мадэль цэласнасці зямной прыроды. З лесам пісьменнік звязваў уласную філасофію жыцця, патаемную муд- расць, гарманізуючы пачатак свету. У навеле «Стары лес» ідэал еднасці чалавека і Космасу гучыць найболын выразна: «Цэлыя вякі жыла пушча згодна і шчаслівa, жыла поўным, бага- тым жыццём... » [2, с. 17]. Беларускі Космас народнаму паэту ўяўляўся востравам пасярод акіяна (тут — балота) і Прадрэвам (дубам) — воссю свету на ім. Лес у коласаўскай літаратурнай спадчыне выступав не толькі як асноўная ландшафтная форма, але і як эстэтычная катэгорыя. Ен успрымаецца паэтам як своеасаблівы феномен прыгажосці. Паэтызацыя лесу пранізвае амаль усе празаічныя і вершава- ныя коласаўскія творы. Лесу, поўнаму чараў, прысвечана нямала старонак паэмы «Новая зямля»: «Каля пасады лясніковай // Цягнуў- ся гожаю падковай // Стары, высокі лес цяні- сты» [7, с. 33]. Трылогія «На ростанях» так- сама пачынаецца песняй-гімнам лесу: «... Лес зрэдку разрываўся невялічкамі палянкамі, на некаторых рунела жыта, а на краях там-сям паладаліся старадрэвіны хвоі, што пышна разрасліся на прасторы...» [6, с. 16]. Колас у сваіх творах малюе лес надзвычай уражаль- на і запамінальна арыентуе чытача на самае тонкае бачанне, адчуванне прыгажосці навакольнага свету і прыроды. Вывучэнне творчасці Якуба Коласа сведчыць: у яго творах новыя сімвалічныя сэнсы набыў архетып Вады, якая ў міфалогіі выступае ў якасці фундаментальнага элемента космасу, першапачатак быцця, субстан- цыі прыроды. У фальклоры вада трактуецца як крыніца жыцця, але разам з тым увасабляе смяротную небяспеку. Паводле беларускай вуснапаэтычнай творчасці, у вадзе жывуць разнастайныя дэманічныя істоты (Вадзянкі, Русалкі, Іржавень і інш.). Пералічаныя дуалістычныя ўяўленні прасочваюцца ў творчасці Якуба Коласа. Дыскурс коласаўскіх тэкстаў дазваляе выявіць вобраз жывой і мёртвай вады. Міфалагема гаючай вады, якая надзвычай папулярная ў народнай творчасці, распрацоўваецца пісьменнікам у «Казках жыцця», дзе літаральна пануе культ вады. Во- бразы-сімвалы Жывой вады і Мёртвага поля ўключаны Якубам Коласам у працэс яго філасофскіх разваг аб існым. У народнай творчасці гаючая вада з'яўляецца ўвасабленнем жы- ватворнай і абнаўляльнай патэнцыяй. У коласаўскай спадчыне жывая вада становіцца сім- валам культурнага адраджэння Беларусі.

Інтэрпрэтацыя зместу твораў, дзе пераасэнсоўваецца архетып вады, дазваляе меркаваць, што Якуб Колас у алегарычнай форме імкнуўся выказадь маральна-этычныя ісціны, што нараджаліся ў перыяд станаўлення беларускай дзяржаўнасці, нацыянальнай культуры. Праз вобраз вады праецыруюцца пісьменнікам на сацыкультурныя стасункі носьбіты аўтарскай філасофскай думкі — Крынічка, Ручаёк, якія ўвасабляюць сімвал вечнага руху...

У навелах «Супрапь вады», «На чужым грунце», «Гусі» пісьменнік паказвае буянне жыцця менавіта каля крынічак. Аналізую- чы алегарычныя творы Якуба Коласа, пры- ходзіш да высновы, што пісьменнік лічыць асноўнай умовай развіцця грамадства наяў- насць рацыянальнага і разумнага, якое сканцэнтравана ў прыродзе. Мудрасць, уладкаванасць прыроды Колас увасабляе ў вобразе Ручайка, які намаляваны ў навеле «На, чужым грунце». Ручаёк на лузе лічыўся самым мудрым, быў самы старэйшы і лепш за ўсіх ведаў жыццё. Ручаёк аналізуецца пісьменнікам і надзяляецца якасцямі чалавека, які ведае як стварыць сацыяльна адладжаны лад у грамадстве, дасягнуць гармоніі жыцця.

Побач з абазначанымі вышэй вобразамі-архетыпамі ў кожнай этнічнай культуры фарміруюцца архетыпы, дапасаваныя для пэўнага народа. Напрыклад, у германскай культуры склаўся архетыпавы вобраз Ватана, руская этнакультура арыентуецца на таемную святасць, якая выражана ў вобразах «града Китежа». Асаблівасці светапогляду, характару беларускага этнасу ўвасоблены ў архетшавых вобразах Старца і Музыкі.

Аналіз паэтычных і празаічпых тэкстаў Якуба Коласа дазволіў нам выявіць актуалізацыпо паэтам сфарміраванага ў традыцыйнай культуры вобраза Старца. Гэты ўзмоцнены мастаком этнакультурны архетып прысутнічае ў паэмах «Сымон-музыка», «Новая зямля», трылогіі «На ростанях», аповесці «Дрыгва», апавяданнях «Паўлюковы думы», «Крывавы пір». Праз даволі глыбока распраца- ваны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобраз дзеда Патапа («Крываы пір») пісьменнікам передаюцца асноўныя псіхалагічныя рысы беларуса — памяркоўнасць, разважлівасць, асцярожнасць. Мудры дзед Патап імкнецца напачатку добра ва ўсім разабрацца, перш чым рабіць нейкія высновы.

Да народнага светаадчування, светабачання, этнічнай свядомасці звяртаецца Якуб Колас у паэме «Сымон-музыка». Вобразам дзеда Курылы, жабрака дзеда Данілы ён малюе дасціпны народны розум. Абазначаныя ў паэме героі маюць наяпросты духоўны свет, яны жывуць не толькі сённяшнім днём, але заду мваюцца аб вечных пытаннях жыцця: «Будзе змена, будзе змена!» // Ідзе новае калена, // Яно тут, каля парогу, // Во на свеце ўсе невечна [5, с. 191]. У гэтых роздумах Старца выяўляецца жыццёвая мудрасць беларуса, якая бярэ вытокі з глыбінь народнага бытавання, пранесенага праз стагоддзі. Найвышэй- шай формай чалавечай мудрасці, лічыць паэт, з'яўляецца ўменне чакаць пры ўсіх нягодах жыцця, не губляць надзеі на лепшую будучыню.

Працэс сацыяльнага прасвятлення таленавітага самародка Сымона адбываецца пад уплывам таксама дзеда Курылы, які першы распазнае ў хлопчыку адметныя здольнасці і імкнецца развіць іх, накіраваць у патрэбнае рэчышча. Менавіта ён падараваў падлетку спачатку дудку, а потым і скрыпку і акрэсліў мэту і абавязак музыкі: «Скрыпка — хлеб твой і апора, // Дык шануй яе, мой сын: // Скрыпка верна ўсім служыла, // Каб і ты ёй верны быў» [5, с. 38]. Словамі дзеда Курылы паэт фармулюе канцэпцыю еднасці мастака і народа. Па думку Якуба Коласа, мастак павінен быць выразнікам глыбінных народных інтарэсаў, імкненяў і дум.

Заключэнне. Поўнае зліццё эпічнай філасофскай думкі Якуба Коласа з народнай мудрасіцо адчуваецца ў створаных ім вобразах палешукаў у трылогіі «На ростанях». Лейтматывам гэтага літаратурнага твора, на наш погляд, з'яўляецца ідэя адзінства зямлі і чалавека, побыту і прыроды. Непаўторная прырода Палесся, на думку пісьменніка, вызначала ўвесь лад натуральнага, непаўторнага ў сваёй цэласнасці свету палешукоў. Якуб Колас схіляецца да думкі, што народ, які жыве ў такім свеце, не можа не быць мудрым. І літаратурныя коласаўскія героі, якія пазнаюць гэты дзівосны свет, убіраюць яго ў сябе, адначасо- ва спасцігаюць і мудрасць народа. Народнасць адчування жыцця ўвасабляецца пісьменнікам у вобразах старога Мікіты, дзяцькі Рамана, вытокі іх спасціжэння жыццёвай мудрасці, па меркаванні Якуба Коласа, неабходна шукаць І у назіранні за з'явамі прыроды: «Бясконцыя балоты вучылі іх мудраму разважанню, мора лясоў выхоўвала ў іх засцярогу... » [6, с. 104]. Менавіта прырода, падкрэслівае пісьменнік, вызначае дух народа, яго мысленне. Яго героі ў прыроды чэрпаюць духоўную сілу, неабходныя практычныя веды, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Колас адзначае, што палескія старыя дзяды былі жывымі летапісцамі гісторыі, тымі слупамі, тымі падмуркамі, на якіх трымаліся традыцыі славянскай старажытнасці. Гэта былі самавукі-аграномы, тлумачальнікі розных прыгодаў жыцця. Яны ведал!, у які дзень, у якую нават часіну трэба сеяць тую ці іншую збажыну... [6, с. 104].

Прысутнасць архетыпавага вобраза Старца ў творах Коласа, на наш погляд, адпавядае патэнцыяльнай аўтарскай сэнсавай абумоўленасці творчасці ў кантэксце філасофскай канцэпцыі пісьменніка.

ЛІТАР АТ У РА


1. Колас, Я. 36. твораў: у 14 т. / Я. Колас. — Мінск: Мает, літ., 1972. — Т. 1.
2. Колас, Я. 36. твораў: у 14 т. / Я. Колас. — Мінск: Мает. літ., 1972. — Т. 3.
3. Колас, Я. 36. твораў: у 14 т. / Я. Колас. — Мінск: Мает. літ-, 1972. — Т. 4.
4. Колас, Я. 36. твораў: у 14 т. / Я. Колас. — Мінск: Мает. літ., 1972. — Т. 5.
5. Колас, Я. Сымон-музыка: паэма для еярэд. і ст. шк. узросту / Я. Колас. — Мінск: Юнацтва, 1991. — 270 с.: іл.
6. Колас, Я. На ростанях: трылогія / Я. Колас. — Мінск: Дзярж. вучэб.-пед. выдавецтва Мін-ва асветы БССР, 1958. — 697 с.
7. Колас, Я. Новая зямля: паэма / Я. Колас; агул, рэд., паслясл. Я. Янушкевіча; уклад. У. Гілеп, Я. Янушкевіч; прад. М. Мушынскага; пер. на рус. С. Гарадзецкага і інш.; пер. на польск. Ч. Сэню- ха; камент. М. Мушынскага, Я. Янушкевіча; мает. В. Шаранговіча. — Мінек: БФК, 2002. — 904с., 91 л. іл.
8. Лосев, А.Ф. Из ранних произведений / А. Ф. Лосев. — М.: Республика, 1990. — 136 с.
9. Фромм, Э. Революция надежды / пер. с нем. Т. В. Панфиловой // Психоанализ и этика / Э. Фромм. -- М.: Республика, 1993. — С. 218-343.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ